# Сустрэча праз паўвека

**Наш горад наведала дэлегацыя былых ураджэнцаў Лунінца, якія цяпер жывуць у Ізраілі.**

Гэтых людзей нельга назваць іншаземцамі. Дэлегацыя грамадзян Ізраіля – ураджэнцы Лунінца, якія па волі лёсу наведалі яго ўпершыню за 50 гадоў.

Паўстагоддзя – гэта шмат ці не? Для вечнасці – імгненне, а для асобнага чалавека – вечнасць. Вельмі шмат падзей адбылося ў гэты тэрмін – не на адно чалавечае жыццё.

Гэтыя людзі выехалі ў краіну продкаў перад вайной ці ў першыя гады пасля яе. Іх дзяцінства прайшло ў Лунінцы, дзе яны нарадзіліся, вучыліся ў школах, сябравалі з аднагодкамі. Вайна па-свойму распарадзілася лёсам кожнага.

Памяць пра загінуўшых – святое пачуццё кожнага чалавека. Вядома, што менавіта яўрэйскага насельніцтва больш за ўсё знішчылі фашысты. Зразумела, што пасля кароткага знаёмства з горадам, дзе ледзь-ледзь угадваюцца рысы старога, даваеннага Лунінца, жыхары Ізраіля наведалі магілу ахвяр Лунінецкага гета. Былі ўскладзены кветкі ад аб'яднання яўрэяў з Лунінца і Кажан-Гарадка ў Ізраілі, райсавета, малога прадпрыемства „Лунінецрамбуд", якое даглядае за гэтым месцам, ад лунінчан. На помніку замацавана шыльдачка, якая на двух мовах – іўрыце і беларускай – нагадвае пра гэту трагедыю.

Да ўдзельнікаў урачыста-жалобнай цырымоніі звярнуўся кіраўнік таварыства выхадцаў з Лунінца і Кажан-Гарадка ў Ізраілі Доў Левін:

– Паважаныя грамадзяне горада Лунінца! Мы, ураджэнцы Лунінца, дзеці, моладзь і старыя, пайшлі па шляху нашых продкаў у краіну яўрэяў – Ізраіль. Але родныя і блізкія большасці з нас засталіся ў Лунінцы. Яны пахаваны тут на гэтым месцы, нашы дарагія бацькі, браты, сёстры. Нямецкія фашысты зверскі знішчылі амаль усіх яўрэяў і кінулі іх бязвінныя трупы ў яму, перад якой мы цяпер стаім. Гэта месца – усё, што засталося нам у памяць пра нашых родных, якіх мы цяпер аплакваем. Няхай будзе ім пухам зямля.

Госці прывезлі жменю зямлі з Ізраіля, якую рассыпалі на магіле, запалілі свечкі памяці.

Кветкі былі ўскладзены таксама да кургана Славы.

У другой палове дня дэлегацыю з Ізраіля прыняў старшыня раённага Савета народных дэпутатаў, народны дэпутат Рэспублікі Беларусь П. А. Скарабагацька. Улічваючы, што сярод нашых землякоў прадстаўнікі розных сфер жыццядзейнасці – работнікі міністэрства асветы і кібуца, ваенныя і будаўнікі, мастакі і бізнесмены – размова вялася пра наладжванне міжнародных дзелавых кантактаў.

У гэты ж дзень адбыўся мітынг каля рэканструяванага помніка ахвярам Кажан-Гарадзецкага гета.

Як ні аддаляецца ў часе вайна, але помнікі загінуўшым будуць вечна хваляваць сэрцы. Яны быццам заклікаюць:

„Трагедыі гета і спаленых вёсак не павінны паўтарыцца. Людзі, памятайце пра ахвяры і сцеражыце мір!"

Т. ВАСІЛЬЕВА.